УДК 94(476)+323.15(476)

***Пушкін І. О.,***
*канд. іст. наук, доцент кафедри гуманітарних дисциплін,*
*Могилівський державний університет харчування, м. Могилів, Республіка Білорусь*

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕНШАСЦІ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯХ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991–2012 ГГ.)

*У артыкуле даследаваны грамадска-палітычная і культурная дзейнасць нацыянальных меншасцей Рэспублікі Беларусь у 1991–2012 г. У ёй разгледжаны мэты і праграмныя кірункі развіцця грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцей Беларусі. Прааналізавана грамадская і культурная дзейнасць. Вызначаны агульныя тэндэнцыі і роля нацыянальных меншасцей у сучасным беларускім грамадстве. Сфармулявана і абгрунтавана наяўнасць трох этапаў у культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці нацыянальных меншасцей. Выяўлена заканамернасць пра залежнасць кірункаў дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў ад палітыкі дзяржавы. Зроблены высnova, што дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў садзейнічае працэсу фармавання грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *Рэспубліка Беларусь; нацыянальные меншасці; нацыянальная палітыка.*

Грамадска-палітычныя і культурныя працэсы, якія адбываліся ў перыяд станаўлення і развіцця Рэспублікі Беларусь далі адчувальны штуршок развіццю культуры, палітычнай і нацыянальнай свядомасці беларусаў і большасці народаў, якія пражываюць на тэрыторыі краіны. У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана паняцце «нацыянальная супольнасць» [1, с. 6]. Безумоўна, пад гэтым паняццем можна разумець усе нацыянальнасці, якія пражываюць на тэрыторыі краіны, у тым ліку і беларусаў. У афіцыйных і часткі навуковых публікацый у Рэспубліцы Беларусь тэрмін «нацыянальныя супольнасці» ужываецца ў абазначэнні нацыянальных меншасцей. Непасрэдна словазлучэнне «нацыянальныя меншасці» выкарыстоўваецца пры падпісанні міжнародных дамоў.

Дэмаграфія, побыт, сацыяльна-эканамічнае, культурна-асветніцкае і грамадскае жыццё асобных нацыянальных меншасцей Рэспублікі Беларусь, рэгіянальныя аспекты, кірункі нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі, прававое рэгуляванне міжнацыянальных адносін разглядаліся ў публікацыях Н. Бурай [2], Т. Гавіна [3], І. Іофе [4], С. Думіна і І. Канапацкага [5], М. Касцюка [6], Л. Лыча [7], І. Пушкіна [8], А. Рагімава [9], У. Тугая [10], Г. Калюжнай [11] і іншых даследчыкаў. Аднак існуючыя навуковыя працы закранаюць толькі пэўныя аспекты даследуемага пытання, яны не вычэрпваюць усёй глыбіні тэмы. Толькі выкарыстанне новага дакументальнага матэрыялу, а таксама комплексны, крытычны аналіз усіх груп крыніц (архіўных і апублікаваных) дазваляе стварыць агульную карціну ўдзелу нацыянальных меншасцей ў працэсах грамадска-палітычных пераўтварэнняў у першае дваццаціголдзе існавання Рэспублікі Беларусь. Мэта артыкула – вызначэнне агульных тэндэнцый развіцця і ролі нацыянальных меншасцей у сучасным беларускім грамадстве.

У Рэспубліцы Беларусь пражываюць каля 9,5 млн чалавек. Згодна перапісу насельніцтва 2009 г. 83,7 % жыхароў краіны – беларусы, 8,3 % – рускія, 3,1 % – палякі, 1,7 % – украінцы, 0,1 % – яўрэі, 3,1 % – іншыя (з іх 2,4 % не ўказалі нацыянальнасць). Калі параўноўваць колькасць прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей з папярэднімі перапісамі, то павялічылася колькасць армян, азербайджанцаў, арабаў, грузін, асецін, таджыкаў, туркмен; паменшылася колькасць амаль усіх іншых нацыянальнасцей (яўрэяў, рускіх, украінцаў, палякаў, татар, літоўцаў, латышоў, эстонцаў і інш.). Значна скарацілася колькасць яўрэяў, што звязана з ад'ездам апошніх за межы Беларусі. Працэнт рускіх стаў адпавядаць 1959 г., калі стаў пашырацца працэс русіфікацыі. У 2009 г. амаль у 4 разы павялічылася колькасць тых нацыянальнасцей, якія з'явіліся ў Беларусі ў пасляваенны час і ў перыяд існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь [12].

У разглядаемы перыяд прадстаўнікі большасці нацыянальных меншасцей пражывалі па ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дысперсна, у асноўным у гарадскіх пасёлках, і займалі даволі высокія статусныя пазіцыі (за выключэннем некаторых, напрыклад, цыгане) у сацыяльнай структуры, эканоміцы, палітыцы і культуры беларускага грамадства. Гэта тлумачыцца тым, што нацыянальныя групы актыўна папаўняліся, яшчэ ў перыяд існавання СССР, за кошт высокаадукаваных мігрантаў з іншых саюзных рэспублік.

У Беларусі сфармавалася такая мадэль дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцей, пры якой вядучая роля адводзілася дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, якія былі створаны іх прадстаўнікамі, пры фінансавай, прававой, арганізацыйнай падтрымцы і кантролі з боку дзяржаўных структур. Першыя грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцей з'явіліся ў канцы 1980-х гг. У 1988 г. у г. Гродна пры абласным аб'яднанні савецкага фонду культуры было створана Гродзенскае абласное польскае культурна-асветнае таварыства імя А. Міцкевіча. Мэтай таварыства з'яўлялася прапаганда польскай

мовы і культуры, наладжванне і падтрымка сувязей з грамадскімі аб'яднаннямі ў Польшчы. У гэтай жа вобласці стала прыкметнай актыўнасць татарскай абшчыны ў г. п. Іўя. Яна арганізацыйна далучылася да «Саюза літоўскіх татар», які дзейнічаў пры Літоўскім фондзе культуры. «Саюз літоўскіх татар» ставіў задачу вывучэння гісторыі і культуры татар, якія жылі на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Польшчы. Восенню 1989 г. узніклі першыя татарскія культурна-асветныя таварыствы ў Мінску і Гродна. У лютым 1990 г. стварылася таварыства «Палонія». 16.06.1990 г. на з'ездзе была ўтворана самая масавая нацыянальная рэспубліканская арганізацыя – «Саюз палякаў на Беларусі» (СПБ) [3, s. 87–109]. У пачатку 1989 г. было створана Мінскае таварыства яўрэйскай культуры. На сярэдзіну 1990 г. дзейнічалі 11 нацыянальных культурна-асветных таварыстваў і аб'яднанняў.

Сёння ў Беларусі дзейнічаюць каля 125 грамадскіх арганізацый (ГА) і іх саюзаў, якія прадстаўляюць 24 нацыянальныя меншасці. Сярод арганізацый – 4 яўрэйскіх, 12 польскіх, 9 нямецкіх, па 8 рускіх і літоўскіх, па 5 азербайджанскіх, украінскіх і татарскіх, 3 армянскіх, 4 цыганскіх, па 2 грэчаскія і грузінскія. Маюцца нацыянальныя арганізацыі арабаў, афганцаў, башкіраў, грузінаў, дагестанцаў, казахаў, карэйцаў, латышоў, малдаван, сірыйцаў, туркаў, чувашоў, эстонцаў [13]. 38 арганізацый атрымалі статус міжнародных і рэспубліканскіх.

Усім зразумела, што роля і ўплыў на развіццё грамадства у першую чаргу залежаць ад нацыянальна-дзяржаўнай палітыцы, якая праводзіцца ў краіне. Канстытуцыя і заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы міжнацыянальных адносін дазваляюць праводзіць у жыццё прынцыпы нацыянальнай палітыкі, накіраванай на адносна свабоднае развіццё культур, моў, традыцый усіх нацыянальных меншасцей на аснове роўнасці, павагі і ўліку іх правоў і інтарэсаў, а таксама пэўнай падтрымкі з боку дзяржавы ў здзяйсненні дадзеных правоў. Асобы, якія займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў нашай краіне неаднаразова падкрэслівалі сваю прынцыповую пазіцыю аб прытрымліванні агульнапрызнаных прынцыпаў і норм, выкананні добраахвотна ўзятых на сябе абавязкаў у дадзенай сферы, у поўным выкананні абвешчаных дэмакратычных прынцыпаў нацыянальнай палітыкі [14].

На нацыянальна-дзяржаўную палітыку аказвалі ўплыў працэс фарміравання аўтарытарнага палітычнага рэжыму ў краіне і знешнепалітычныя фактары. У прыватнасці, падтрымка дзейнасці ГА нацыянальных меншасцей была выклікана спробамі ўладаў Рэспублікі Беларусь пераадолець крызіс у знешнепалітычных стасунках з шэрагам краін і для паляпшэння эканамічных, палітычных адносін з краінамі паходжання нацыянальных меншасцей Беларусі.

Нарматыўна-прававая база стварыла досыць камфортныя ўмовы для развіцця культур нацыянальных меншасцей і задавальнення іх этнакультурных запатрабаванняў. 11.11.1992 пастановаю Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь быў уведзены ў дзеянне Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь». У яго змест уносіліся змяненні і дапаўненні ў 2004, 2007 гг. [15]. Дзяржава спрыяе развіццю культур усіх нацыянальных меншасцей, якія жывуць у краіне. Гэта забяспечвалася добраўпарадкаванай і разгалінаванай сістэмай дзеянняў дзяржаўных органаў улады ў галіне пратэкцыі правоў нацыянальных меншасцей. Дзяржаўная падтрымка культурнай дзейнасці нацыянальных меншасцей і кантроль за іх грамадскімі арганізацыямі актывізаваліся з другой паловы 1990-х гг., пасля стварэння органаў адказных за правядзенне нацыянальна-канфесійнай палітыкі: Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, які ўваходзіў у склад Міністэрства культуры, Кардынацыйнай рады па справах нацыянальных меншасцей (1995–1997 гг.), Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей (1997–2001 гг.). Апошні ў 2002–2006 гг. атрымаў статус Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў, а з 2006 г. апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей [16].

Прыярытэт у дзейнасці адпаведных дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь атрымоўвалі праекты, праграмы і мерапрыемствы, якія мелі міжкультурны характар, былі накіраваны на здзяйсненне і развіццё міжнацыянальнага дыялогу. Прыярытэт належыў інтэрнацыянальным кірункам.

Аналіз крыніц дазваляе сцвярджаць, што структуры прадстаўнічай і выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь прымалі рашэнні ўзважана, з улікам дзяржаўных інтарэсаў, а таксама грамадска-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы. Нацыянальная палітыка дзяржаўнай улады насіла характар пратэкцыянізму і здзяйснялася ў цэлым выверанымі, прадуманымі крокамі, пры наяўнасці пэўных недахопаў, якія можна выправіць. У дзеяннях уладаў прасочвалася схіленне да комплекснага вырашэння існуючых праблем нацыянальных меншасцей. У выніку правядзення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі, якая забеспечвала задавальненне культурна-асветных і грамадскіх запатрабаванняў нацыянальных меншасцей з улікам агульнанацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, у грамадстве склаліся стабільныя міжнацыянальныя адносіны.

Варта адзначыць пераемнасць этнакультурнай палітыкі Беларусі ў адносінах да «нацыянальнай палітыкі» СССР. Тэрміналогія, канцэптуальная арганізацыя кіравання раснастайнасцю і аперацыянальныя падыходы да яе, якія сфарміраваліся ў савецкі перыяд і выразна сфармуляваныя ў канцы 1980-х гадоў, засталіся ў цэлым без змен. Гэта дазваляе зрабіць выснову пра вызначальную ролю савецкай ідэалагічнай і істытуцыянальнай спадчыны ў кіраванні этнакультурнай разнастайнасцю ў перыяд навейшай гісторыі Беларусі.

Грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцей ажыццяўлялі культурна-асветніцкія, дабрачынныя і адукацыйныя праграмы пры падтрымцы рэспубліканскіх і муніцыпальных улад. Іх дзейнасць была накіравана на вывучэнне гісторыі, культуры, мастацтва сваіх народаў, правядзенне сустрэч, семінараў, свят, фестывалей, выстаў, канферэнцый, наладжванне сувязей з краінамі іх паходжання. Была створана вялікая колькасць творчых і мастацкіх самадзейных калектываў пры нацыянальных аб'яднаннях і дзяржаўных установах культуры. Масавымі, яскравымі і разнас-

тайнымі былі фестывалі нацыянальных культур. Мэта фестываляў – гарманізацыя міжнацыянальных адносін і развіццё шматвяковых традыцый дабратворнага ўзаемадзеяння культур нацыянальных супольнасцей Беларусі. Усебеларускі фестываль нацыянальных культур праходзіў раз у два гады (першыя два называліся Рэспубліканскімі фестывалямі нацыянальных культур). IX фестываль адбыўся ў 2012 г.

На базе некаторых агульнаадукацыйных школ, пазашкольных, клубных, бібліятэчных устаноў сістэм Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры па ініцыятыве прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей былі ўтвораны школы, класы, факультатывы, гурткі па навучанню і выхаванню на роднай мове, даследаванню гісторыі і культуры дадзенай супольнасці. Цяпер у Беларусі функцыянуюць 4 установы адукацыі, у якіх навучанне ажыццяўляецца на мовах нацыянальных меншасцей: 2 школы з польскай мовай навучання і выхавання (у Гродне і Ваўкавыску) і 2 школы з літоўскай мовай навучання і выхавання (у вёсках Рымдзюны Астравецкага раёна і Пеляса Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці). На мове нацыянальных меншасцей у 2013/2014 навучальным годзе навучаліся 794 вучні (на польскай – 669, літоўскай – 125 вучняў). Акрамя таго, ў 135 установах агульнай сярэдняй адукацыі 4 997 вучняў вывучалі мовы нацыянальнай меншасці на вучэбных занятках, факультатыўных занятках або ў аб'яднаннях па інтарэсах: польскую мову – 4 702 вучні, літоўскую мову – 30 вучняў, яўрэйскую мову – 265 вучняў [17].

Усё гэта спрыяла адраджэнню і фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Гэтаму таксама садзейнічала дабрачыннасць, абарона сацыяльных і эканамічных правоў. Найбольш актыўнымі з'яўляліся яўрэйскія і польскія грамадскія фарміраванні. У той жа час большасць насельніцтва краіны не была знаёма з дзейнасцю ГА нацыянальных меншасцей Беларусі. Грамадскія арганізацыі не змаглі цалкам пазбавіцца ад жорсткай апекі з боку дзяржаўных органаў.

Узнікненне і дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў гэта вынік ініцыятывы прадстаўнікоў этнічных супольнасцей з больш высокім сацыяльным статусам. Дзейнасць ГА нацыянальных меншасцей была сканцэнтравана пераважна ў гарадах і ўзровень іх актыўнасці ва ўсходнім рэгіёне Рэспублікі Беларусь быў значна ніжэй, чым у заходнім. Не кампактнасць пражывання нацыянальных меншасцей на ўсходзе Беларусі абумовіла нязначны ўплыў нацыянальных аб'яднанняў на насельніцтва дадзенага рэгіёна і паменшала верагоднасць узнікнення праблем у міжнацыянальных адносінах.

Нягледзячы на адсутнасць антаганістычных сутычак і канфліктаў, у Беларусі былі пэўныя праблемы ў міжнацыянальных адносінах. Заўважаліся праявы антысемітызму. Былі складанасці ў адносінах з цыганскай і польскай супольнасцямі, выпадкі абвастрэння міжнацыянальных адносін з асобамі каўказскай нацыянальнасці і грамадзянамі Туркменістана.

Этнічны радыкалізм сярод часткі насельніцтва Беларусі прысутнічае, прычым не паменшыўся за перыяд з 1997 г. У якасці сацыялагічных індыкатараў этнічнага радыкалізму былі ўжыты варыянты адказаў у ананімнай анкеце пра розныя забаронныя меры ў адносінах да прадстаўнікоў нетытульных нацый, а таксама згода рэспандэнтаў з прапановай высяліць іх з Беларусі сілай ці нават вынішчыць фізічна. У прыватнасці, было высветлена, што забарону на заняцце важных адміністрацыйных пасад выхадцамі некарэнных народаў цалкам ці збольшага падтрымае больш 50 % грамадзян Беларусі, забарону на куплю зямлі і нерухомасці для чужынцаў ухваліць каля паловы насельніцтва краіны. Абмежаванне прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей па месцах пражывання станоўча ўспрымуць больш траціны жыхароў Беларусі. Супраць змяшаных шлюбаў выступіў кожны чацвёрты ўдзельнік апытання. За гвалтоўнае высяленне за межы Беларусі прадстаўнікоў шэрагу нацый выказаўся кожны пяты. А ксенафобія ў рэцыдыўнай форме зафіксавана ў 6,2 % рэспандэнтаў, якія лічаць магчымым фізічнае знішчэнне прадстаўнікоў некаторых этнасаў [18; 19].

Усе выпадкі праяўлення ксенафобіі, экстрэмізму і нецярпімасці не заставаліся без належнага рэагавання адпаведных дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь. За перыяд з 2003 па 2010 г. у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь за здзяйсненне злачынстваў на глебе расавай дыскрымінацыі было асуджана [20]: 2003 г. − 4 чал. (частка 3 артыкула 130); 2006 г. − 2 чал. (частка 1 артыкула 193); 2007 г. − 2 чал. (частка 1 артыкула 193); 2 чал. (пункт 14 часткі 2 артыкула 139); 1 чал. (частка 3 артыкулы 147); 2008 г. − 1 чал. (частка 2 артыкула 130); 2009 г. – 1 чал. (частка 1 артыкула130).

Па частцы 1 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, на зневажэнне нацыянальнага гонару і годнасці) асуджаны 1 чалавек з прызначэннем пакарання ў выглядзе штрафу, па частцы 2 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (наўмысныя дзеянні, накіраваныя на узбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, на зневажэнне нацыянальнага гонару і годнасці, звязаныя з гвалтам або здзейсненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў) асуджаны 1 чалавек з прызначэннем пакарання ў выглядзе 3 (трох) гадоў пазбаўлення волі, па частцы 3 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (дзеянні, прадугледжаныя часткамі першага ці другога дадзенага артыкула, здзейсненыя групай асоб або пацягнулыя па неасцярожнасці смерць чалавека або іншыя цяжкія наступствы) асуджана 4 чалавека, з іх двум асобам прызначана пакаранне ў выглядзе 5 (пяці) гадоў пазбаўлення волі, яшчэ двум − пазбаўленне волі на тэрмін 8 (восем) гадоў.

У Рэспубліцы Беларусь існуе моўная праблема, якая тычыцца статуса і выкарыстоўвання беларускай мовы. Своеасаблівасць моўнай сітуацыі ў тым, што асноўным сродкам зносін большасці беларускага насельніцтва з'яўлялася руская мова, хаця пераважная колькасць жыхароў Рэспублікі Беларусь называла нацыянальную мову роднай. Прасочваецца заканамернасць: высокая канцэнтрацыя польскага насельніцтва спрыяе павелічэнню частотнасці выкарыстоўвання беларускай мовы ў параўнанні з іншымі абласцямі. Вялікая частка палякаў (58 %) роднай мовай назвалі

беларускую. Па меры набліжэння да мяжы з Расіяй назіраецца зніжэнне частотнасці ўжывання беларускай мовы, што пацверджана дадзенымі па Магілёўскай вобласці.

Асаблівасцю сучаснай моўнай сітуацыі Беларусі з'яўляецца тое, што на сённяшні дзень асэнсаванне беларускай самаідэнтыфікацыі па лінгвістычнай прыкмеце не з'яўляецца дамінантным ва ўспрыманні беларусаў. Пры даволі высокай ступені самаідэнтыфікацыі беларусаў як асобнай нацыі, адна з самых галоўных прыкмет нацыі – агульная мова народа – застаецца незапатрабаванай. Беларуская мова не выконвае сваёй ролі найважнейшага сродку этнічнай камунікацыі, але захоўвае іншае значэнне – сімвалічнай складовай этнічнай культуры і традыцыі. Беларускае насельніцтва валодае развітай, устойлівай самаідэнтыфікацыяй, аднак у стадыі развіцця знаходзіцца нацыянальная самасвядомасць у яе шырокім разуменні, якое ўключае разуменне народам уласнай сутнасці, свайго становішча сярод іншых народаў, сваёй ролі ў гісторыі чалавецтва, усведамленне свайго права на незалежнае існаванне і на самабытную этнічную культуру [21].

У грамадскім жыцці нацыянальных меншасцей вылучаюцца тры этапы. 1) 1991–1995 гг. – гэта перыяд ідэнтыфікацыі і актывізацыі, найвышэйшага ўзроўню грамадскай дзейнасці нацыянальных меншасцей. Праводзілася палітыка неўмяшальніцтва ў дзейнасць грамадскіх нацыянальна-культурных арганізацый. Асноўная ўвага дзяржаўных органаў была накіравана на развіццё адукацыі нацыянальных меншасцей на іх родных мовах. На піке беларусізацыі значна ўзрасла колькасць школ, дзе вывучалася мова нацыянальных меншасцей. Паступова фарміраваліся элементы грамадзянскай супольнасці і актывісцкага тыпу палітычнай культуры насельніцтва, арыентаванай на рынак і канкурэнтную барацьбу. Была створана прававая база, якая забяспечыла спрыяльныя ўмовы для свабоднага развіцця ўсіх культур нацыянальных меншасцей Беларусі. 2) 1996–2000 гг. – заканадаўчае рэгуляванне і паступовае згортванне ініцыятыў. Нацыянальная палітыка была накіравана на вырашэнне праблем забеспячэння правоў нацыянальных меншасцей і задавальнення этнакультурных запытаў насельніцтва. З 1999 г. назіралася памяншэнне актыўнасці з боку як асобных прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, так і нацыянальных грамадскіх арганізацый. 3) з пачатку 2000-х гадоў – перыяд рэгламентаванага кантролю з боку дзяржаўных выканаўчых органаў, дзейнасць толькі ў рэчышчы ўзгодненых і дазволенных мерапрыемстваў. Пераважае падтрымка інтэрнацыянальнага і выкарыстоўванне праграмных метадаў працы. Нацыянальна-дзяржаўныя дачыненні ў краіне развіваюцца па шляху перахода да інтэграцыйнай мадэлі ўзаемаадносін у кірунку пратэкцыі правоў нацыянальных меншасцей. Заўважаецца рэзкае звужэнне функцыянавання беларускай мовы і моў нацыянальных меншасцей на карысць рускай. Выразна акрэслілася тэндэнцыя да зніжэння прэстыжу роднай мовы, нават у якасці этнічнага сімвала.

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь адсутнічалі сутыкненні і вострыя канфлікты на этнічнай, расавай, лінгвістычнай і канфесійнай аснове. Такое становішча тлумачыцца менталітэтам беларускага народа, гістарычнымі традыцыямі мірнага міжэтнічнага супрацоўніцтва, даўнімі і трывалымі сувязямі між этнічнымі групамі, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі, існаваўшым заканадаўствам у сферы міжнацыянальных адносін і нацыянальна-дзяржаўнай палітыкай. У пэўнай ступені і адносна невялікай колькасцю прадстаўнікоў не славянскага насельніцтва, але колькасць якіх стабільна павялічваецца.

Кірункі дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў залежылі ад палітыцы дзяржавы і тыпу палітычнага рэжыма ў Рэспубліцы Беларусь. Дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцей садзейнічала працэсу фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.

У перыяд навейшай гісторыі Беларусі (1991–2012 гг.) прадстаўнікі нацыянальных меншасцей унеслі значны ўклад у развіццё беларускай культуры, навукі, спорта, эканомікі і грамадства. Сваё імкненне да творчай самарэалізацыі, задавальненню нацыянальных запатрабаванняў прадстаўнікі нацыянальных меншасцей рэалізоўвалі, выкарыстоўваючы ў поўным аб'ёме магчымасці ў культурна-асветніцкай сферы. Неабходна адзначыць, што ў пэўных рэгіёнах жаданне паказаць культуру нацыянальных меншасцей, якія пражывалі на іх тэрыторыі, прыводзіла да таго, што зусім не было бачна беларускай.

Эфектыўная грамадска-палітычная, культурна-асветніцкая дзейнасць і самарэалізацыя нацыянальных меншасцей, іх высокі сацыяльна-прававы статус у Беларусі забяспечваюць адну з галоўных умоў – заахвочванне рэгіянальных і нацыянальна-культурных аб'яднанняў, падтрымку нацыянальных культур і традыцый, якая неабходна для працякання натуральных працэсаў сацыяльных змен у краіне ва ўмовах устойлівага пастпальнага развіцця беларускага грамадства.

### ЛІТАРАТУРА


1. Конституция Республики Беларусь 1994 года : с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г. – 8-е изд., стер. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2012. – 64 с.
2. Бурая Н. В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) / Н. В. Бурая // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2007. – № 1. – С. 46–49.
3. Gawin T. Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. Historia działaności / T. Gawin. – Białystok, 2007. – 586 s.
4. Иоффе Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси / Э. Г. Иоффе. – Минск : Арти-Фекс, 1996. – 292 с.
5. Думін С. У. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць / С. У. Думін, І. Б. Канапацкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 206 с.
6. Касцюк М. П. Узаемаадносіны этнічных супольнасцей на Беларусі ў XX ст. / М. П. Касцюк // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) / У. І. Навіцкі, М. С. Сташкевіч. – Мінск : Дэполіс, 2001. – С. 24–31.

7. Лыч Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.) / Л. Лыч. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 76 с.
8. Пушкін І. А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.) : [манаграфія] / І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2007. – 206 с.
9. Рагимов А. Н. Социально-демографическая характеристика этнических груп народов Кавказа, проживающих в Республике Беларусь, по материалам переписей населения / А. Н. Рагимов // Доклады Национальной академии наук Беларуси. – 2011. – Т. 5. – № 4. – С. 118–124.
10. Тугай У. В. Латышы на Беларусі / У. В. Тугай. – Мінск : Выд. Ул. М. Скакун, 1999. – 136 с.
11. Калюжна Г. Ю. Діяльність білоруського громадського об'єднання ўкраїнців «Ватра» по відроджэнню і збереженню мові, культуры і народної творчості ўкраїнців Білорусі / Г. Ю. Калюжна // Беларусь – Україна: гістарычны вопыт узаемаадносін : матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск : Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 387–393.
12. Перепись населения 2009. Национальный состав населения Республики Беларусь. Том III. – Минск : Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2011. – 433 с.
13. Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік / Складальнік Н. В. Ходар. – Мінск : «Энцыклапедыкс», 2004. – 272 с.
14. Государство для народа : Доклад Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко // Государство для народа : документы и материалы Третьего Всебелорусского собрания, 2–3 марта 2006 года, Минск / редкол. : А. Н. Рубинов и др. – Минск : Беларусь, 2006. – С. 9–74.
15. О национальных меньшинствах в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь 11 ноября 1992 г. № 1926–XII, изменения и дополнения : Закон от 5 января 2004 г. № 261–3 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь (НРПА). – 2004. – № 4. – 2/1010.
16. Пушкін І. А. Дзейнасць інстытутаў дзяржаўнай улады па рэгуляванні міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) / І. А. Пушкін // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2013. – № 9. – С. 32–39.
17. Навіны Беларусі. БЕЛТА. 24 ліпеня 2014 года // http://blr.belta.by/all_news/society/Abavjazkovy-ekzamen-pa-gstory-Belarus-buduts-zdavats-z-2015-goda-vypusknk-11-x-klasa_i_69683.html.
18. Бубнов Ю. М. Социологический очерк потенциальной этнической нетерпимости в белорусском обществе / Ю. М. Бубнов // Вестник Брестского университета. Серия 1. – 2012. – № 1. – С. 129–138.
19. Бубнов Ю. М. Формы этнической дискриминации / Ю. М. Бубнов // Молодёжная галактика : ежегодный Альманах НИИКСИ Санкт-Петербургского государственного университета. – 2013. – № 9 – С. 88–92.
20. Доклады Беларуси от 18 ноября 2012 г. восемнадцатый и девятнадцатый периодические доклады по выполнению положений Международной конвенции о ликвидации всех форм расовой дискриминации, подлежавшие представлению 8 мая 2008 года. CERD/C/BLR/18-19. П. 53–54 // http://www2.ohchr.org/english/bodies/cerd/cerds83.htm.
21. Бунас А. У. Асаблівасці беларускай самасвядомасці і роля нацыянальнай мовы ў фарміраванні этнічнай самаідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва / А. У. Бунас // Гуманитарный альманах : сборник статей. – Могилёв : МГУП. – 2013. – С. 88–100.


***И. А. Пушкин,*** *Могилевский государственный университет питания, г. Могилев, Республика Беларусь*

## *НАЦИОНАЛЬНЫЕ МЕНЬШИНСТВА В ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИХ ПРЕОБРАЗОВАНИЯХ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ (1991–2012 ГГ.).*

*В статье исследована общественно-политическая и культурная деятельность национальных меньшинств Республики Беларусь в 1991–2012 гг. В ней рассмотрены цели и программные направления развития общественных объединений национальных меньшинств Беларуси. Проанализирована общественная, культурная деятельность. Определены общие тенденции и роль национальных меньшинств в современном белорусском обществе. Сформулировано и обосновано наличие трех этапов в культурно-просветительской и общественно-политической жизни национальных меньшинств. Выявлена закономерность о зависимости направлений деятельности национальных общественных объединений от политики государства. Сделан вывод, что деятельность национальных общественных объединений содействует процессу формирования гражданского сообщества в Беларуси.*

***Ключевые слова:*** *Республика Беларусь; национальные меньшинства; национальная политика.*

***I. A. Pushkin,*** *Mogilev State University of Food, Mogilev, Belarus*

## *NATIONAL MINORITIES IN THE SOCIO-POLITICAL CHANGES IN BELARUS (1991–2012)*

*The article deals with socio-political and cultural activities of national minorities in the Republic of Belarus in the period of 1991–2012. Goals and program orientations of the development of public associations of national minorities of Belarus are considered. Public and cultural activities and charitable work are analyzed. Common tendencies and the role of national minorities in the modern Belarusian society are determined. Existence of three stages in socio-educational and socio-political life was defined and substantiated. Regularity of the dependence of activities of national public associations on the government's policy is revealed. Conclusion was drawn that activities of national public associations facilitate the process of the formation of civil society in Belarus.*

***Keywords:*** *Republic of Belarus; national minorities; national policy.*

**Рэцэнзенты:** ***Касцюк М. П.,*** д-р гіст. навук, праф.,
акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (НАНБ),
галоўны навуковы супрацоўнік Дзяржаўнай навуковай установы
«Істытут гісторыі НАНБ», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь;
***Бубнаў Ю. М.,*** д-р сацыял. навук, праф., г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь.

© Пушкін І. О., 2015

*Дата надходження статті до редколегії 05.03.2015*